ЦЭНТРАЛЬНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я. КОЛАСА

НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

АДДЗЕЛ РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ

# ФОНД № 29

# "БАГАМОЛАЎ Г.В."

ВОПІС № 1

Крайнія даты матэрыялаў вопісу
1954-1981 і б/д

Колькасць адзінак захавання ў вопісе
168 (сто шэсцьдзесят восем)

Дата афармлення вопісу сакавік 2009 г.

# С Х Е М А
## сістэматызацыі фонду № 29 “Багамолаў Г.В.”
## (1954-1981 і б/д)

**1. Творчыя дакументы (1970-[1980-я гг.] і б/д).**
**2. Дакументы службовай і грамадскай дзейнасці (1964-1980 і б/д).**
2.1. Акадэмія навук БССР (1966-1980).
2.2. Міжнародныя арганізацыі, сімпозіумы, сесіі, канферэнцыі і інш. (1964-1980 і б/д).
2.3. Таварыства “Веды” (1967-1973).
2.4. Іншыя дакументы ([1950?]-1980 і б/д).
**3. Дакументы да біяграфіі (1954-1981 і б/д).**
3.1. Дакументы асабістага характару (1954-1981 і б/д).
3.2. Юбілеі (1965-1980).
3.2.1. 60-годдзе (1965).
3.2.2. 70-годдзе (1975).
3.2.3. 75-годдзе (1980).
**4. Перапіска (1967-[1980] і б/д).**
4.1. Пісьмы да Г.В.Багамолава (1967-[1980] і б/д).
4.1.1. Пісьмы розных асоб (па алфавіце) ([1967]-[1980] і б/д).
4.1.2. Пісьмы ўстаноў і арганізацый (па храналогіі) (1967-[1973] і б/д).
**5. Дакументы пра Г.В.Багамолава ([1972?]-1980).**
**6. Іншыя дакументы (1974-1980).**

**З М Е С Т**
**да вопісу № 1 фонду № 29 “Г.В. Багамолаў”**
**(1954-1981 і б/д)**


| **Назва раздзелаў** | **№ адз. зах.** | **№ стар.** |
|---|---|---|
| 1. Творчыя дакументы | 1-8 | 1-2 |
| 2. Дакументы службовай і грамадскай дзейнасці | 9-63 | 2-14 |
| 2.1. Акадэмія навук БССР | 9-29 | 2-7 |
| 2.2. Міжнародныя арганізацыі, сімпозіумы, сесіі, канферэнцыі і інш. | 30-46 | 7-10 |
| 2.3. Таварыства “Веды” | 47-51 | 11 |
| 2.4. Іншыя дакументы | 52-63 | 12-14 |
| 3. Дакументы да біяграфіі | 64-119 | 14-23 |
| 3.1. Дакументы асабістага характару | 64-76 | 14-17 |
| 3.2. Юбілеі | 77-119 | 17-23 |
| 3.2.1. 60-годдзе | 77-80 | 17 |
| 3.2.2. 70-годдзе | 81-109 | 17-22 |
| 3.2.3. 75-годдзе | 110-119 | 22-23 |
| 4. Перапіска | 120-162 | 24-28 |
| 4.1. Пісьмы да Г.В.Багамолава | 120-162 | 24-28 |
| 4.1.1. Пісьмы розных асоб (па алфавіце) | 120-155 | 24-27 |
| 4.1.2. Пісьмы ўстаноў і арганізацый (па храналогіі) | 156-162 | 27-28 |
| 5. Дакументы пра Г.В.Багамолава | 163-164 | 28-29 |
| 6. Іншыя дакументы | 165-167 | 29 |

**Д А В Е Д К А**
**пра фондаўтваральніка і склад фонду**
**№ 29 "Багамолаў Г.В."**

Багамолаў Герасім Васільевіч – доктар геолага-мінералагічных навук (1939), акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1960), прафесар (1937), лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР (1947, 1952) і Дзяржаўнай прэміі БССР (1972), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР (1968).

Нарадзіўся ў 1905 г. у вёсцы Слізнёва Сычоўскага р-на Смаленскай вобласці. У 1929 г. скончыў Маскоўскую горную акадэмію. У 1928-1934 гг. пачаў сваю навуковую і працоўную дзейнасць у якасці намесніка начальніка экспедыцыі па водазабеспячэнні г. Мінска. У 1935 г. стаў заснавальнікам і дырэктарам Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута гідралогіі і інжынернай геалогіі. У 1951–1953 гг. Г.В.Багамолаў – намеснік міністра геалогіі СССР. З 1953 г., пасля ліквідацыі Міністэрства геалогіі, ён працуе намеснікам акадэміка-сакратара Аддзялення геолага-геаграфічных навук АН СССР і старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі гідрагеалагічных праблем АН СССР. У 1960 г. Г.В.Багамолаў атрымлівае назначэнне ў Мінск на пасаду дырэктара Інстытута геалагічных навук АН БССР. З 1964 г. вучоны працуе ў лабараторыі геахімічных праблем, арганізаванай ім у складзе дадзенага інстытута, спачатку загадчыкам сектара геатэрміі глыбінных зон, а потым (з 1971 г.) – загадчыкам аддзела гідрахіміі падземных вод і геатэрміі Інстытута геахіміі и геафізікі АН БССР (1977 г. аддзел ператвараецца ў лабараторыю цепламасапераносу ў зямных нетрах).

Г.В.Багамолаў – заснавальнік сучаснай гідрагеалагічнай і інжынерна-геалагічнай школ, геатэрмічнага навуковага напрамку ў Беларусі. У сферу яго навуковых інтарэсаў уваходзілі як тэарэтычныя пытанні геалогіі, так і вырашэнне практычных задач, звязаных з асваеннем прыродных багаццяў, у тым ліку ў Беларусі. Ён распрацаваў методыку ацэнкі вытворчасці ваданосных пластоў, вывучаў пытанні схематызацыі прыродных умоў пры пабудове мадэляў водазабораў падземных вод, абгрунтаваў месца 1-й свідравіны вядомай мінеральнай вады «Мінская-4». Г.В.Багамолаў прапанаваў праекты водазабеспячэння Мінска, эфектыўнасць якіх пацверджана і ў наш час.

Яшчэ ў даваенныя гады вучоны выказаў меркаванне аб магчымасці наяўнасці ў Беларусі карысных выкапняў: солі, нафты, газу, жалезнай руды, вуглю. Гэтыя прагнозы знайшлі адлюстраванне ў першай карце карэнных адкладаў Беларусі. Г.В.Багамолаў прымаў самы актыўны ўдзел у распрацоўцы радовішчаў калійных солей і нафты, у асваенні Палесся. Акадэмікам быў створаны першы ў СССР экалагічны навуковы савет «Распрацоўка навуковых асноў па прадухіленні засалення глебы і водных крыніц адходамі Салігорскіх калійных прадпрыемстваў», які аказаў

актыўнае процідзеянне забруджванню навакольнага асяроддзя ў Салігорскім горна-прамысловым раёне. Г.В.Багамолаву належаць вынаходніцтвы ахоўных экранаў і проціфільтрацыйнай плёнкі для салігорскіх солеадвалаў.

У 1970-х гг. Г.В.Багамолаў арганізаваў вывучэнне рэжыму падземных вод у сувязі з будаўніцтвам мінскага метрапалітэна, што дазволіла ў далейшым пазбегнуць негатыўных вынікаў, звязаных з асушэннем грунтоў.

На працягу многіх гадоў Г.В.Багамолаў прадстаўляў айчынную навуку ў свеце, прымаў удзел у міжнародных навуковых арганізацыях воднага і геалагічнага профілю. Ён з´яўляўся членам Міжнароднага кансультацыйнага савета ЮНЕСКА па арыдных зонах зямнога шара, членам-карэспандэнтам геалагічных таварыстваў Бельгіі і Францыі. У 1979 г. у Канберы (Аўстралія) вучонаму быў нададзены статус Ганаровага прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі гідрагеалагічных навук (МАГН).

Г.В.Багамолаў – аўтар больш за 300 навуковых прац, сярод якіх 15 манаграфій і 5 падручнікаў, выдадзеных на 7 замежных мовах. На працягу 30 год ён выкладаў у Маскоўскім геолагаразведачным інстытуце імя С.Арджанікідзе ў якасці прафесара. За плённую навуковую і грамадскую дзейнасць вучоны быў неаднаразова ўзнагароджаны, у тым ліку ордэнамі Чырвонай Зоркі (1943) і Працоўнага Чырвонага Сцяга (1975).

Памёр Г.В.Багамолаў у 1981 годзе.

Матэрыялы з асабістага архіва Герасіма Васільевіча Багамолава былі перададзены ў рукапісны фонд аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі ў снежні 1981г. Да матэрыялаў быў дададзены вопіс віншавальных адрасоў і ганаровых грамат, якія складаюць значную частку фонду.

Пасля навукова-тэхнічнай апрацоўкі дакументаў фонд налічвае 167 адзінак захавання за перыяд з 1954 па 1981 г.

Архіў складаецца з наступных тэматычных груп:

1. Творчыя дакументы, у склад якіх увайшлі машынапісныя экзэмпляры артыкулаў, прамова і водзыў на аўтарэферат дысертацыі.
2. Дакументы службовай і грамадскай дзейнасці. Гэты раздзел уключае службовыя запіскі, пісьмы, справаздачы і іншыя дакументы, што датычацца працы Г.В.Багамолава ў Акадэміі навук БССР, яго ўдзелу ў міжведамасных і міжнародных арганізацыях, канферэнцыях, нарадах, сімпозіумах, сесіях і інш., а таксама грамадскай дзейнасці ў таварыстве “Веды”.
3. Дакументы да біяграфіі. У раздзел увайшлі, у асноўным, узнагароды і віншавальныя адрасы з нагоды юбілеяў вучонага, а таксама невялікая колькасць дакументаў уласнага характару: прафсаюзныя білеты, мандаты і пасведчанні.
4. Перапіска, якая складаецца з пісьмаў да Г.В. Багамолава розных асоб і ўстаноў.
5. Дакументы пра Г.В.Багамолава. Невялічкі раздзел уключае водзыў на манаграфію “Геотермическая зональность территории БССР”, адным з

аўтараў якой з΄яўляўся Г.В.Багамолаў, і кароткія звесткі пра вучонага ў выданні Прэзідыума АН СССР.

6. Іншыя дакументы, сабраныя Г.В.Багамолавым па геалагічнай тэматыцы.

Сакавік 2009 г. Складальнік І.Л.Мурашова

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Г.В.БАГАМОЛАВА (1970-[1980-я гг.] і б/д) | | | |
| | 1. | Г.В.Багамолаў, А.І.Мацвеева, А.В.Кудзельскі. "Химический состав поровых растворов озёрно-аллювиальных глинистых отложений Западного Полесья". Артыкул. Асобны адбітак з "Докладов Академии наук БССР", 1970, т.XIV, № 7 з дарчым надпісам Г.В.Багамолава [Тугарынаву] Аляксею Іванавічу. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1970 лістап.2 | 5 | |
| | 2. | "Вековой юбилей Минского водопровода". Артыкул. Машынапіс з аўтарскай праўкай, на рускай мове. | 1974 студз.22 | 5 | |
| | 3. | "Основные задачи науки о земле в свете решений XXV съезда КПСС". Артыкул. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | [пасля 1976] | 10 | |
| | 4. | Каментарый да сюжэту "Экран от рассола" кіначасопіса "Наука и техника БССР". Машынапіс з аўтарскай праўкай, на рускай мове. | 1977 жн.26 | 1 | |
| | 5. | "Подземные воды – важный компонент земли и поисковый критерий на полезные ископаемые (на примере некоторых районов Русской платформы)". Артыкул. Аўтарызаваны машынапіс з рукапіснымі праўкамі, на рускай мове. | 1977 снеж.6 | 15 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 6. | Водзыў на аўтарэферат доктарскай дысертацыі В.В.Калодзія “Подземные воды нефтегазоносных провинций и их роль в миграции и аккумуляции нефти (на примере юга СССР)”. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | 1978 кастр.12 | 3 | |
| | 7. | Прамова з нагоды заканчэння будаўніцтва тунеля мінскага метро паміж станцыямі “Парк Чалюскінцаў” і “Акадэмічная”. На дакуменце паметка Г.В.Багамолава: “Речь в котловане метро”. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [1980-я гг.] | 1 | |
| | 8. | Г.В.Багамолаў, А.П. Емяльянаў. “Гидрологические аспекты и воздействие электромагнитных полей на организм человека”. Даведка (?). Машынапіс з рукапіснымі праўкамі Г.В.Багамолава, на рускай мове. | б/д | 5 | |
| | | 2. ДАКУМЕНТЫ СЛУЖБОВАЙ І ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ (1964-1980 і б/д) | | | |
| | | 2.1. Акадэмія навук БССР (1966-1980) | | | |
| | 9. | Матэрыялы (пісьмо Старшыні Упраўлення геалогіі пры СМ БССР П.А.Леановіча, даведка віцэ-прэзідэнта АН БССР К.І.Лукашэва (2 экз.) аб арганізацыі ў АН БССР даследаванняў па праблемам выкарыстання падземных вод. У даведках – рукапісныя праўкі Г.В.Багамолава. Машынапіс, на рускай мове. | 1966 | 6 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 10. | Пісьмо Прэзідэнта АН БССР В.Ф.Купрэвіча, адрасаванае начальніку навукова-арганізацыйнага аддзела Дзяржаўнага камітэта СМ СССР па навуцы і тэхніцы Е.І.Скляраву, па пытанні гідрагеалогіі і асушэння Палесся. У пісьме ўзгадваецца Г.В.Багамолаў. Арыгінал і 2 копіі. Машынапіс, на рускай мове. | 1968 ліп. 1 | 3 | |
| | 11. | Матэрыялы (склад Савета, дакаладная запіска, перапіска і інш.) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Навуковага савета АН БССР па праблеме “Разработка научных основ по предотвращению засоления почв и водных источников отходами Солигорских калийных предприятий” (Г.В.Багамолаў – старшыня Савета). Машынапіс, ратапрынт, на рускай мове. | 1968, 1980 | 14 | |
| | 12. | Справаздачы аб рабоце Г.В.Багамолава за розныя гады. Дадатак: пісьмо акадэміка-сакратара Аддзялення хімічных і геалагічных навук АН БССР М.І.Міцкевіча да Г.В.Багамолава з просьбай падаць справаздачу за 1977 г. Машынапіс, на рускай мове. | 1969, 1977, 1979 | 12 | |
| | 13. | Праграма па тэме “Изучение и картирование геотемпературного поля и теплового потока на территории БССР” на 1972-1976 гг. (Кіраўнік тэмы – Г.В.Багамолаў). Машынапіс, на рускай мове. | 1972 студз.10 | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 14. | Справаздача (?) [аддзела гідрахіміі падземных вод і геатэрміі Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР] па праблеме “Геотермическая изученность территории БССР”. Фрагмент. Чарнавік. Машынапіс з рукапіснымі паметкамі і праўкамі Г.В.Багамолава, на рускай мове. | [пасля 1975] | 5 | |
| | 15. | Службовая запіска Г.В.Багамолава на імя дырэктара Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР К.І. Лукашэва аб выкарыстанні фонду заработнай платы аддзелам гідрахіміі падземных вод і геатэрміі. Дадатак: пісьмо К.І. Лукашэва Прэзідэнту АН БССР М.А.Барысевічу аб дадатковым вылучэнні сродкаў для вышэйзгаданага інстытута. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | 1976 кастр. | 3 | |
| | 16. | Службовая запіска Г.В.Багамолава на імя Старшыні Госплана БССР Ф.А.Коханава і інш. па пытанні арганізацыі вывучэння рэжыму падземных вод у сувязі з будаўніцтвам Мінскага метро. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | 1977 кастр.26 | 1 | |
| | 17. | Матэрыялы (паведамленні, выпіска з пратаколу) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Бюро Аддзялення хімічных і геалагічных навук АН БССР. Машынапіс, на рускай мове. | 1977, 1980 | 3 | |
| | 18. | Службовая запіска Г.В.Багамолава на імя нам. дырэктара Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР В.А.Кузняцова аб пераносе працоўнага адпачынку ў 1978 г. Рукапіс, на рускай мове. | 1978 снеж.22 | 1 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 19. | Матэрыялы (схема, план, суправаджальнае пісьмо старшыні Камісіі Л.М.Сушчэні і інш.) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Навукова-тэхнічнай камісіі АН БССР па тэме “Разработка научно-технического прогноза возможных изменений в биосфере в результате развития отраслей народного хозяйства на период до 1990 г.”. Машынапіс, ратапрынт, на рускай мове. | 1979 студз.15, 1980 мая 29 | 8 | |
| | 20. | Пісьмо і тэлеграма Рэчыцкага метызнага завода, адрасаваныя Г.В.Багамолаву, па пытаннях навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з АН БССР. На тэлеграме – паметкі Г.В.Багамолава. Машынапіс, на рускай мове. | 1979 мая 23, лістап. 22 | 3 | |
| | 21. | Матэрыялы (заданне на правядзенне НДР, паясняльная запіска, даведкі) аб удзеле Г.В.Багамолава ў навукова-даследчых работах Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР па тэме “Выяснить геолого-гидрологические и геохимические закономерности формирования подземных вод с повышенным содержанием железа и дать рекомендации по их рациональному использованию (на примере Северной и Северо-западной частей территории БССР)”. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі і паметкамі [Г.В.Багамолава], на рускай мове. | 1979 | 6 | |
| | 22. | Матэрыялы (спіс супрацоўнікаў, справаздачы, планы і інш.) аб працы лабараторыі цепламасапераноса ў зямных | 1979-1980 | 31 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | нетрах Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР. (Г.В.Багамолаў – загадчык згаданай лабараторыі). Машынапіс, на рускай мове. | | | |
| | 23. | Пастанова Прэзідыума АН БССР “Об утверждении перечня важнейших республиканских комплексных программ в области естественных, технических и общественных наук на 1981-1985 гг.”. Ратапрынт, на рускай мове. | 1980 студз.10 | 8 | |
| | 24. | Склад Навуковага савета Акадэміі навук БССР па праблемам біясферы. (Г.В.Багамолаў – старшыня секціі водных рэсурсаў). Ратапрынт, на рускай мове. | 1980 сак.18 | 6 | |
| | 25. | Паведамленне Украінскага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута аб тым, што ён не праводзіць даследаванняў па тэме “Поровые растворы в геологии”. Машынапіс з рукапіснымі паметкамі Г.В.Багамолава, на рускай мове. | 1980 сак. | 1 | |
| | 26. | Даведка Беларускага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута галургіі, адрасаваная Г.В.Багамолаву, па пытанні “Утилизация твердых галитовых отходов ПО “Беларуськалий”. Машынапіс, на рускай мове. | 1980 ліп.18 | 4 | |
| | 27. | Дагавор аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж Інстытутам геахіміі і геафізікі АН БССР і Беларускім навукова-даследчым санітарна-гігіенічным інстытутам Мінздрава БССР. Дакумент падпісаны Г.В.Багамолавым. Машынапіс, на рускай мове. | 1980 жн.28 | 4 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Спраўводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 28. | Дакладная запіска Г.В.Багамолава на імя дырэктара Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР Р.Г.Гарэцкага аб выданні зборніка “Калийная промышленность СССР и окружающая среда” у 1983 г. і праспект-план вышэйзгаданага зборніка. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | 1980 верас.4,9 | 6 | |
| | 29. | Парадак дня пасяджэння вучонага савета Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР, дасланы Г.В.Багамолаву. Машынапіс, друк, на рускай мове. | 1980 верас.17 | 1 | |
| | | 2.2. Міжнародныя арганізацыі, сімпозіумы, сесіі, канферэнцыі і інш. (1964-1980 і б/д) | | | |
| | 30. | Дакументы (пропускі на канферэнцыю і ў гасцініцу) аб удзеле Г.В.Багамолава ў 13-ай сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў Парыжы. Друк, рукапіс, на французскай мове. | 1964 | 3 | |
| | 31. | Запрашальныя білеты АН БССР на ўдзел Г.В.Багамолава ў партыйных і агульных сходах, навуковых сесіях і ўрачыстых мерапрыемствах. Друк, машынапіс, рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 1967-1980 | 21 | |
| | 32. | Запрашальныя білеты розных устаноў на ўдзел Г.В.Багамолава ў рабоце сімпозіумаў, канферэнцый, нарад і інш. Друк, машынапіс, ратапрынт, на рускай, азербайджанскай мовах. | 1967-1980 і б/д | 23 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 33. | Пратаколы нарад па пытаннях водазабораў на тэрыторыі Беларусі. Сярод удзельнікаў нарад – Г.В.Багамолаў.Дадатак: канверт з рукапіснымі паметкамі Г.В.Багамолава па вышэйзгаданай тэме. Машынапіс, на рускай мове. | 1968-1980 | 6 | |
| | 34. | Пісьмо міністра замежных спраў БССР А.Гурыновіча, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай прадставіць прапановы БССР да Праграмы ЮНЕСКА на 1971-1972 гг. Дадатак: “Наука об окружающей среде и исследование естественных богатств”. Раздзел Праграмы ЮНЕСКА і рэзалюцыя Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА па дадзенай праграме. У тэксце – рукапісныя паметкі Г.В.Багамолава. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 1969 сак.21 | 68 | |
| | 35. | Матэрыялы (запрашэнне, парадак дня, даведка і інш.) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Камісіі па міжнародным навуковым сувязям пры Прэзідыуме АН СССР. Машынапіс з рукапіснымі паметкамі Г.В.Багамолава, на рускай мове. | 1969 | 10 | |
| | 36. | Даведка аб правядзенні ў Беларусі Міжнароднага сімпозіума “Гидрология заболоченных территорий”, накіраваная ў ЦК КПБ. Машынапіс з рукапіснымі праўкамі [Г.В.Багамолава], на рускай мове. | [1960-я гг.] | 5 | |
| | 37. | Матэрыялы (запрашэнне, парадак дня) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Міжведамаснага камітэта СССР па Міжнароднаму гідралагічнаму дзесяцігоддзю. Машынапіс, на рускай мове. | 1970 лют.10 | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 38. | Пісьмо В.І.Смірнова, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з прапановай падрыхтаваць артыкул для выдання “Проблемы геологии и полезных ископаемых на 24-й сессии Международного Геологического конгресса 1972 года в Канаде”. Машынапіс, на рускай мове. | 1972 | 1 | |
| | 39. | Тэлеграма Аддзялення геалогіі, геафізікі і геахіміі АН СССР, адрасаваная Г.В.Багамолаву, з прывітаннем удзельнікам сімпозіума па поравым растворам. Машынапіс, на рускай мове. | [1973?] | 1 | |
| | 40. | Матэрыялы (запрашэнне, парадак дня) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Міжведамаснага камітэта СССР па Міжнароднай гідралагічнай праграме. Машынапіс, на рускай мове. | 1976 студз.15 | 2 | |
| | 41. | Пісьмо Нацыянальнага камітэта геолагаў СССР, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай падаць звесткі аб яго ўдзеле ў міжнародных арганізацыях. Машынапіс, на рускай мове. | 1977 верас.30 | 1 | |
| | 42. | Справаздача Г.В.Багамолава аб пленарным пасяджэнні Камісіі падземных вод Міжнароднай Асацыяцыі гідралагічных навук у Англіі (Бірмінгем, 23-30 ліпеня 1977 г.). Дадатак: даведка ст. кансультанта [Упраўлення знешніх зносін] АН СССР Е.П.Шахаўскога аб удзеле ў рабоце вышэйзгаданай арганізацыі, дасланая Г.В.Багамолаву. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | 1977 | 9 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 43. | Міжнародная тэлеграма, адрасаваная Г.В.Багамолаву (у [Міжведамасны геафізічны камітэт пры Прэзідыуме АН СССР?]), аб вылучэнні фінансавых сродкаў для паездкі ў Францыю. Машынапіс, на англійскай мове. | [1978] | 1 | |
| | 44. | Памятка ўдзельнікам Усесаюзнага семінара “Органическое вещество в современных ископаемых осадках”, дасланая Г.В.Багамолаву. Машынапіс, на рускай мове. | [1979] | 1 | |
| | 45. | Справаздача Г.В.Багамолава і В.В.Куприянава аб працы савецкай дэлегацыі на Міжнародным сімпозіуме “Влияние деятельности человека на гидрологический режим” і аб пасяджэнні бюро Міжнароднай Асацыяцыі гідралагічных навук (МАГН) 23-26 чэрвеня 1980 г. (Хельсінкі-Фінляндыя). Машынапіс, на рускай мове. | 1980 ліп. | 15 | |
| | 46. | Тэлеграма інстытута “Дзяржхімпраект” (Масква) і Харкаўскага інстытута глебазнаўства, адрасаваная Г.В.Багамолаву, аб прыбыцці ў Мінск удзельнікаў нарады. На адваротным баку дакумента – паметкі Г.В.Багамолава. Машынапіс, на рускай мове. | б/д | 1 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 2.3. Таварыства “Веды” (1967-1973) | | | |
| | 47. | Граматы таварыстваў “Веды” СССР і БССР, выдадзеныя Г.В.Багамолаву за актыўны ўдзел у рабоце арганізацый. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 1967, 1970, 1973 | 5 | |
| | 48. | Дакументы таварыства “Веды” АН БССР (план мерапрыемстваў, пастанова Пленума і інш.), прынятыя ў сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна.У дакументах – рукапісныя паметкі Г.В.Багамолава. Машынапіс, ратапрынт, рукапіс, на рускай мове. | 1968 студз. і б/д | 7 | |
| | 49. | Справаздача аб дзейнасці таварыства “Веды” АН БССР. Машынапіс, на рускай мове. | [1968] | 6 | |
| | 50. | Матэрыялы (план работы, пастанова) аб удзеле Г.В.Багамолава ў рабоце Прэзідыума Праўлення таварыства “Веды” АН БССР (Г.В.Багамолаў – старшыня Праўлення). Ратапрынт, на рускай мове. | 1970 студз. 12,15 | 6 | |
| | 51. | Пастанова Прэзідыума Праўлення таварыства “Веды” БССР аб узнагароджанні Г.В.Багамолава імяным гадзіннікам за актыўную працу па кіраўніцтву арганізацыяй у АН БССР. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 1970 лют.13 | 1 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Спраўводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 2.4. Іншыя дакументы ([1950?]-1980 і б/д) | | | |
| | 52. | Пісьмо Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай даслаць яго працу "Чем богаты недра Белоруссии" (Мн., 1950) для навукова-тэхнічнай бібліятэкі вышэйзгаданага інстытута. Машынапіс, на рускай мове. | [пасля 1950?] | 1 | |
| | 53. | Рашэнне Навуковага савета па геатэрмічным даследаванням АН СССР па пытанні "Использование глубинного тепла Земли в народнохозяйственных целях" і суправаджальнае пісьмо, адрасаванае Г.В.Багамолаву. Машынапіс, на рускай мове. | 1972 сак. | 11 | |
| | 54. | Пісьмо В.П.Ільіна, аспіранта Ленінградскага горнага інстытута, да Г.В.Багамолава з просьбай аб уладкаванні яго на працу ў Інстытут галургіі (г.Мінск). Машынапіс, на рускай мове. | 1973 | 1 | |
| | 55. | Пісьмы Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута і Міністэрства геалогіі СССР, адрасаваныя Г.В.Багамолаву, аб удзеле яго ў выданні Міжнароднай гідрагеалагічнай карты Еўропы (тэрыторыя СССР). Машынапіс, на рускай мове. | 1976, 1977 | 2 | |
| | 56. | Матэрыялы (план навуковых даследаванняў, праект пастановы і інш.) для разгляду на пасяджэнні Савета | 1977 верас. | 7 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Міністраў БССР па пытанні “О мерах по сохранению и рациональному использованию природных ресурсов бассейна озера Нарочь”, дасланыя Г.В.Багамолаву. Машынапіс, на рускай мове. | | | |
| | 57. | Пісьмо Маскоўскага геолагаразведачнага інстытута імя С.Арджанікідзе, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай аб падтрымцы ідэі стварэння ў складзе Інстытута праблемнай лабараторыі па замацаванню і ліквідаванню свідравін на ваду, і пісьмо Навуковага савета АН БССР у Дзяржаўны Камітэт СМ СССР па вышэйзгаднаму пытанню. Машынапіс, на рускай мове. | 1978 снеж.13 і б/д | 2 | |
| | 58. | Пісьмы Дзяржаўнага Камітэта СССР па навуцы і тэхніцы, адрасаваныя Г.В.Багамолаву, з просьбай прыняць удзел у пасяджэннях Навуковага савета “Комплексное использование и охрана водных ресурсов”. Машынапіс, на рускай мове. | 1978, 1979 | 2 | |
| | 59. | Пісьмо кафедры інжынернай геалогіі і гідралогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з запрашэннем прачытаць курс лекцый. Машынапіс, на рускай мове. | [1979] | 2 | |
| | 60. | Матэрыялы (пісьмо старшыні Савета Г.Каваленка, раздзел праекта “Основные направления в мелиоративном стро-ительстве...”) аб удзеле Г.В.Багамолава ў | 1980 і б/д | 3 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | рабоце Рэспубліканскага міжведамаснага навукова-тэхнічнага савета па праблемам меліярацыі пры СМ БССР. Машынапіс, ратапрынт, на рускай мове. | | | |
| | 61. | Пісьмо рэктара БДУ імя У.І.Леніна В.А.Белага, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай прыняць удзел у навукова-педагагічнай дзейнасці згаданай установы. Машынапіс, на рускай мове. | [1980] | 1 | |
| | 62. | Праект артыкула “Беларускае Палессе” для Беларускай Савецкай Энцыклапедыі і суправаджальнае пісьмо Ф.П.Вінакурава, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай даслаць яго заўвагі да гэтага артыкула. Ратапрынт, машынапіс, на беларускай, рускай мовах. | б/д | 4 | |
| | 63. | Пісьмо В.В.Ляховіча, адрасаванае Г.В.Багамолаву, з просьбай прыняць удзел у падрыхтоўцы да выдання кнігі-атласа “Геология в значках”. Машынапіс, на рускай мове. | б/д | 1 | |
| | | 3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ (1954-1981 і б/д) | | | |
| | | 3.1. Дакументы асабістага характару (1954-1981 і б/д) | | | |
| | 64. | Прафсаюзныя білеты, уліковая картка члена прафсаюза, талон аб зняцці з партыйнага ўліку і інш. дакументы біяграфічнага і бытавога характару. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1954-1981 і б/д | 32 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 65. | Ганаровыя граматы Прэзідыума, парткома, групкома і камітэта камсамола АН БССР, выдадзеныя за навуковую і грамадска-палітычную дзейнасць. Машынапіс, на рускай мове. | [1967, 1972, 1977] | 5 | |
| | 66. | Віншавальныя пісьмы і паштоўкі з нагоды прысваення Г.В.Багамолаву ганаровага звання заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі БССР. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1968 | 4 | |
| | 67. | Ганаровыя граматы Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР і Інстытута геалагічных навук Міністэрства геалогіі СССР, выдадзеныя за вялікі ўклад у геалагічную навуку. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 1968-1978 | 7 | |
| | 68. | Ганаровая грамата Ваеннага Савета Чырвонасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, выдадзеная за актыўны ўдзел у ваенна-шэфскай рабоце. Друк, на рускай мове. | 1970 чэрв.1 | 1 | |
| | 69. | Мандаты і паведамленне аб абранні Г.В.Багамолава дэлегатам партыйных канферэнцый. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1970, 1973 і б/д | 6 | |
| | 70. | Віншавальнае пісьмо Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне навукі і тэхнікі і тэлеграма Інстытута фізікі цвёрдага цела АН БССР з нагоды прысуджэння Г.В.Багамолаву Дзяржаўнай прэміі БССР. Машынапіс, на рускай, беларускай мовах. | 1973 студз.2 і б/д | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 71. | Аўтарскае пасведчанне, выдадзенае Дзяржаўным камітэтам СМ СССР па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў на вынаходніцтва “Способ создания экрана для предотвращения утечки”. Друк, машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1973 ліп.6 | 4 | |
| | 72. | Пасведчанне да знака “Победитель социалистического соревнования 1973 г.” Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1974 лют.11 | 2 | |
| | 73. | Даведка аб асноўных напрамках навуковай дзейнасці з кароткімі біяграфічнымі звесткамі, складзеная Г.В.Багамолавым, для выдання агляду гісторыі геалогіі ў межах АН БССР. Дадатак: пісьмо В.В.Ціхамірава да Г.В.Багамолава з просьбай даслаць дадзеную даведку. Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | 1975 чэрв.5 | 4 | |
| | 74. | Камандзіровачнае пасведчанне аб паездцы ў Гомельскую вобласць для прапаганды рашэнняў XXV з′езда КПСС. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 1976 сак.30 | 1 | |
| | 75. | Дыплом I ступені і пасведчанне Савета выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі БССР, выдадзеныя за навуковае кіраўніцтва і ўкараненне ў вытворчасць ахоўнага экрана з цагляна-салевой сумесі на палімернай плёнцы. Друк, рукапіс, на беларускай, рускай мовах. | 1977 чэрв.6 | 3 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 76. | Аўтарскае пасведчанне, выдадзенае Дзяржаўным камітэтам СМ СССР па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў на вынаходніцтва “Способ создания противофильтрационного экрана”. Друк, машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1977 верас.21 | 3 | |
| | | 3.2. Юбілеі (1965-1980) | | | |
| | | 3.2.1. 60-годдзе (1965) | | | |
| | 77. | Віншавальны адрас Інстытута геалагічных навук Госгеалкома СССР. Вокладка з металічнай гравіраванай накладкай. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1965 | 4 | |
| | 78. | Віншавальны адрас Прэзідыума, партыйнага і групавога камітэтаў АН БССР. Машынапіс, на рускай мове. | 1965 | 1 | |
| | 79. | Віншавальныя адрасы Інстытутаў АН БССР. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | 1965 | 8 | |
| | 80. | Віншавальны адрас калектыву работнікаў Госплана БССР. Друк, на рускай мове. | [1965] | 2 | |
| | | 3.2.2. 70-годдзе (1975) | | | |
| | 81. | Віншавальны адрас Калегіі Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі СССР. Друк, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 82. | Віншавальныя адрасы Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў Мінводгаса СССР і аддзела выкарыстання падземных вод дадзенага інстытута. Вокладкі з металічнымі гравіраванымі накладкамі. Рукапіс, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 8 | |
| | 83. | Віншавальны адрас Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі. Вокладка з металічнай гравіраванай накладкай. Рукапіс, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 4 | |
| | 84. | Віншавальныя адрасы Усесаюзнага навукова-даследчага і праектнага інстытута галургіі і Беларускага філіяла дадзенага інстытута. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 6 | |
| | 85. | Віншавальны адрас Госплана БССР. Друк, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 2 | |
| | 86. | Віншавальны адрас Заходняга аддзялення Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя У.І.Леніна (ВАСХНИЛ). Друк, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 2 | |
| | 87. | Віншавальныя адрасы Аддзялення хімічных і геалагічных навук і Аддзялення фізіка-тэхнічных навук АН БССР. Друк, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 4 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 88. | Віншавальны адрас Беларускай геолага-гідралагічнай экспедыцыі. Вокладка з гравіраванай накладкай. Рукапіс, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 4 | |
| | 89. | Віншавальны адрас Беларускага калійнага камбіната імя 50-годдзя СССР. Вокладка з гравіраванай накладкай. Друк, на рускай мове. | 1975 сак.17 | 4 | |
| | 90. | Віншавальныя адрасы Маскоўскага геолагаразведачнага інстытута імя С.Арджанікідзе, Маскоўскага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тарфянай прамысловасці і факультэта газанафтавай геалогіі, геафізікі і геахіміі Маскоўскага інстытута нафтахімічнай і газавай прамысловасці. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1975 | 6 | |
| | 91. | Віншавальныя адрасы Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі і Інстытута фізіка-арганічнай хіміі АН БССР. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1975 | 6 | |
| | 92. | Віншавальны адрас Міжведамаснага геафізічнага камітэта пры Прэзідыуме АН СССР і секцыі гідралогіі. Машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 2 | |
| | 93. | Віншавальныя адрасы Інстытута геалогіі і распрацоўкі гаручых выкапняў, ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Геалагічнага інстытута і Інстытута водных праблем АН СССР. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 8 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ<br>АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 94. | Віншавальны адрас кіраўніцтва Усесаюзнага вытворчага праектнага аб´яднання “Саюзводпраект”. Вокладка з выцісненым адрасным надпісам. Машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 4 | |
| | 95. | Віншавальны адрас калектыву кафедры гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі Ленінградскага горнага інстытута. Друк, на рускай мове. | [1975] | 4 | |
| | 96. | Віншавальны адрас ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытута мерзлатазнаўства Сібірскага аддзялення АН СССР. Рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 2 | |
| | 97. | Віншавальны адрас Калегіі Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР. Друк. на рускай мове. | [1975] | 2 | |
| | 98. | Віншавальныя адрасы і ганаровая грамата Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР. Віншавальныя адрасы ў вокладках з металічнымі гравіраванымі накладкамі. Друк, машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 10 | |
| | 99. | Віншавальны адрас Беларускага дзяржаўнага інстытута інжынерных пошукаў Дзяржстроя БССР. Рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 2 | |
| | 100. | Віншавальны адрас Беларускага навукова-даследчага санітарна-гігіенічнага інстыту-та. Машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 101. | Віншавальныя адрасы Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута. Вокладкі з гравіраванымі накладкамі. Машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 10 | |
| | 102. | Віншавальны адрас Упраўлення геалогіі пры СМ БССР і калектыву геолага-разведчыкаў Беларусі. Вокладка з металічнай гравіраванай накладкай. Друк, на рускай мове. | [1975] | 3 | |
| | 103. | Віншавальныя адрасы геолагаў-нафтавікоў Беларусі, аб′яднання “Беларуснафта”, трэста “Белнафтагазразведка”. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 8 | |
| | 104. | Віншавальны адрас ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ўпраўлення “Водаканал” г. Мінска. Рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 2 | |
| | 105. | Віншавальныя адрасы Украінскага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута, аддзела меліяратыўнай гідралогіі Украінскага навукова-даследчага інстытута гідратэхнікі і меліярацыі, экспедыцыі заходніх абласцей УССР. Рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 8 | |
| | 106. | Віншавальныя тэлеграмы, паштоўкі і пісьмо акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР: А.Александровіча, А.Ахрэма, М.Барысевіча, А.Дзмітрыева, В.Белага, П.Бялькевіча, П.Броўкі, Ф.Вінакурава, К.Горава і інш. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 12 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Спраnázводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 107. | Віншавальныя тэлеграмы і паштоўкі розных асоб. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 61 | |
| | 108. | Віншавальныя пісьмы, тэлеграмы і паштоўкі розных устаноў. Арыгіналы і копіі. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове | [1975] | 41 | |
| | 109. | Пералік тэлеграм, пісьмаў, віншавальных адрасоў (папак), атрыманых з нагоды 70-годдзя з дня нараджэння акадэміка АН БССР Г.В.Багамолава. 2 экз. Машынапіс, на рускай мове. | [1975] | 14 | |
| | | 3.2.3. 75-годдзе (1980) | | | |
| | 110. | Віншавальны адрас Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў Мінводгаса СССР. Рукапіс, на рускай мове. | 1980 сак.17 | 2 | |
| | 111. | Віншавальны адрас Госплана БССР. Друк, на рускай мове. | 1980 сак.17 | 2 | |
| | 112. | Віншавальны адрас Калегіі Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР. Друк, на рускай мове. | 1980 сак.17 | 2 | |
| | 113. | Віншавальныя адрасы, ганаровая грамата і паведамленне Інстытута геахімі і геафізікі АН БССР. Друк, машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1980 | 12 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 114. | Віншавальныя адрасы калектываў Інстытута торфу АН БССР і Аддзялення хімічных і геалагічных навук АН БССР. Друк, машынапіс, на рускай мове. | 1980 | 4 | |
| | 115. | Віншавальныя тэлеграмы, пісьмо і паштоўка розных асоб і ўстаноў. Машынапіс, на рускай мове. | 1980 | 4 | |
| | 116. | Віншавальны адрас Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута. Друк, на рускай мове. | [1980] | 2 | |
| | 117. | Віншавальны адрас Беларускага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага і праектнага інстытута галургіі. Вокладка з выціснутай лічбай “75”. Рукапіс тушшу, на рускай мове. | [1980] | 4 | |
| | 118. | Віншавальны адрас лабараторый меліярацыі тарфянай і мінеральнай глебы Беларускага навукова-даследчага інстытута меліярацыі і воднай гаспадаркі Друк, на рускай мове. | [1980] | 2 | |
| | 119. | Віншавальны адрас ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга вытворчага аб΄яднання “Мінскводаканал”. Рукапіс, на рускай мове. | [1980] | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 4. ПЕРАПІСКА<br>(1967-[1980] і б/д) | | | |
| | | 4.1. Пісьмы да Г.В.Багамолава<br>(1967-[1980] і б/д) | | | |
| | | 4.1.1. Пісьмы розных асоб (па алфавіце)<br>([1967]-[1980] і б/д) | | | |
| | 120. | Віншавальныя паштоўкі Альдэкопа [Юрыя Артуравіча]. Рукапіс, на рускай мове. | б/д | 2 | |
| | 121. | Віншавальная паштоўка [Аўксенцьева]. Рукапіс, на рускай мове. | [1967] | 1 | |
| | 122. | Віншавальныя паштоўкі Бардышэва [Івана Іларыёнавіча]. Рукапіс, на рускай мове. | [1976] і б/д | 3 | |
| | 123. | Пісьмо Барысевіча [Мікалая Александравіча] з падзякай за віншаванне з нагоды прысуджэння яму Ленінскай прэміі. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1980 мая 27 | 1 | |
| | 124. | Віншавальныя паштоўкі Бялькевіча [Пятра Іларыёнавіча]. Рукапіс, на рускай мове. | 1973, [1976] і б/д | 3 | |
| | 125. | Віншавальная паштоўка Верто [Артура]. Рукапіс, на рускай мове. | [1972] | 1 | |
| | 126. | Пісьмо Д.Гардзеева. Рукапіс, на рускай мове. | 1979 крас.17 | 1 | |
| | 127. | Віншавальныя паштоўкі Гарэцкага [Гаўрылы Іванавіча]. Рукапіс, на рускай, беларускай мовах. | 1970 снеж.26, 1980 мая 3 | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 128. | Віншавальная паштоўка Гарэцкага [Радзіма Гаўрылавіча]. Рукапіс, на рускай мове. | [1972] | 1 | |
| | 129. | Віншавальныя паштоўкі В.Г.Герасімава. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | б/д | 2 | |
| | 130. | Віншавальная паштоўка сям′і Горавых да Г.В.Багамолава і яго жонкі Франчэскі Уладзіміраўны. Рукапіс, на рускай мове. | [1972] | 1 | |
| | 131. | Віншавальная паштоўка Н.Далуханавай. Рукапіс, на рускай мове. | б/д | 1 | |
| | 132. | Віншавальныя паштоўкі Дземідзіенкі Аляксандра Якаўлевіча. Рукапіс, на рускай мове. | [1970] і б/д | 2 | |
| | 133. | Віншавальныя паштоўкі Дзілна Іевы Людзвігаўны. Рукапіс, на рускай мове. | 1970-1972 | 4 | |
| | 134. | Віншавальныя паштоўкі Дж. Зульфугарлы. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | [1976, 1978] | 3 | |
| | 135. | Віншавальная паштоўка Івіцкага [Андрэя Ігнатавіча]. Рукапіс, на рускай мове. | 1975 | 1 | |
| | 136. | Віншавальныя паштоўкі Іодказіса [Вітаўтаса]. Рукапіс, на рускай мове. | б/д | 2 | |
| | 137. | Віншавальная паштоўка Ісамухамедава Яркіна. Рукапіс, на рускай мове. | [1975] | 1 | |
| | 138. | Віншавальныя паштоўкі Канавалава [Яўмена Рыгоравіча]. Машынапіс, на рускай мове. | [1970], 1972 | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 139. | Пісьмо і віншавальная паштоўка Карцава [Аляксея Аляксандравіча]. Машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1971 і б/д | 2 | |
| | 140. | Віншавальная паштоўка А.Клімаса. Рукапіс, на рускай мове. | 1975 | 1 | |
| | 141. | Віншавальная паштоўка В.П.Кляменцьева да Г.В.Багамолава і яго жонкі Франчэскі Уладзіміраўны. Рукапіс, на рускай мове. | [1972] | 1 | |
| | 142. | Віншавальная паштоўка [К.Ланге]. Рукапіс, на рускай мове. | 1973 снеж.20 | 1 | |
| | 143. | Віншавальныя паштоўкі сям΄і Міцкевічаў. Рукапіс, на рускай мове. | 1971, 1973 | 2 | |
| | 144. | Паштоўка Ю.В.Мухіна. Рукапіс, на рускай мове. | 1971 мая 18 | 1 | |
| | 145. | Віншавальная паштоўка В.Новік[ава]. Рукапіс, на рускай мове. | б/д | 1 | |
| | 146. | Віншавальная паштоўка Э.І.Сардарава. Рукапіс, на рускай мове. | [1970] | 1 | |
| | 147. | Віншавальная паштоўка Н.Свольскага. Друк, рукапіс, на рускай мове. | б/д | 1 | |
| | 148. | Віншавальныя паштоўкі Сіраты [Мікалая Мікалаевіча] і яго сям΄і. Рукапіс, на рускай мове. | 1972, 1975 | 2 | |
| | 149. | Віншавальная паштоўка і пісьмо Скарапанава [Сцяпана Гардзеевіча]. Машынапіс, на рускай мове. | [1967], 1968 | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 150. | Пісьмо Сяргеева [Яўгена Міхайлавіча] з падзякай за віншаванне з нагоды абрання яго акадэмікам АН СССР. Машынапіс, на рускай мове. | 1979 крас.23 | 2 | |
| | 151. | Віншавальныя паштоўкі Талсціхіна [Нестара Іванавіча]. Рукапіс, на рускай мове. | [1969-1972] і б/д | 5 | |
| | 152. | Віншавальная паштоўка Туроўскага. Рукапіс, на рускай мове. | [1971] | 1 | |
| | 153. | Віншавальная паштоўка [Ф.Ше...ова?]. Рукапіс, на рускай мове. | [1976] | 1 | |
| | 154. | Віншавальныя паштоўкі І.Шукайлы. Машынапіс, на рускай мове. | [1980] і б/д | 2 | |
| | 155. | Віншавальныя паштоўкі неўстаноўленых асоб. Рукапіс, машынапіс, на рускай мове. | б/д | 4 | |
| | | 4.1.2. Пісьмы ўстаноў і арганізацый (па храналогіі) (1967-[1973] і б/д) | | | |
| | 156. | Віншавальныя паштоўкі Прэзідыума АН БССР (М.Барысевіча, В.Купрэвіча). Друк, машынапіс, рукапіс, на рускай мове. | 1967-1971 і б/д | 14 | |
| | 157. | Віншавальная паштоўка калектыву Комплекснай тэматычнай партыі трэста “Белнафтагазразведка”. Машынапіс, на рускай мове. | [1969] | 2 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | 158. | Віншавальная паштоўка Упраўлення хімічнай прамысловасці пры СМ БССР. Машынапіс, на рускай мове. | [1970] | 1 | |
| | 159. | Віншавальная паштоўка Інстытута сейсмалогіі Узбекскай ССР. Машынапіс, на рускай мове. | [1970] | 1 | |
| | 160. | Віншавальная паштоўка Гомельскага КТП. Машынапіс, на рускай мове. | [1973] | 1 | |
| | 161. | Віншавальная паштоўка Інстытута водных праблем АН СССР. Машынапіс, на рускай мове. | б/д | 2 | |
| | 162. | Віншавальная паштоўка калектыву Львоўскай гідрагеолага-меліяратыўнай экспедыцыі. Машынапіс, на рускай мове. | б/д | 1 | |
| | | 5. ДАКУМЕНТЫ ПРА Г.В. БАГАМОЛАВА ([1972?]-1980) | | | |
| | 163. | В.І.Лялько, М.М.Мітнік. Водзыў на манаграфію Г.В.Багамолава і інш. “Геотермическая зональность территории БССР” (Мн., 1972). Аўтарызаваны машынапіс, на рускай мове. | [пасля 1972?] | 3 | |
| | 164. | “Сообщения Междуведомственного геофизического комитета при Президиуме АН СССР”. 1980, 24 сакавіка, 11 красавіка | 1980 сак.24, крас.11 | 3 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | У выпусках узгадваецца 75-гадовы юбілей Г.В.Багамолава і звесткі пра абранне яго Ганаровым прэзідэнтам Міжнароднай асацыяцыі гідралагічных навук. Друк, машынапіс, на рускай мове. | | | |
| | | 6. ІНШЫЯ ДАКУМЕНТЫ (1974-1980) | | | |
| | 165. | В. Панфілава. “Нефть Белоруссии”. Артыкул. Выразка з газеты “Вечерний Минск”, 1974, 19 сакавіка. Друк, на рускай мове. | 1974 сак.19 | 1 | |
| | 166. | “Библиография научных трудов члена-корреспондента АН БССР А.И.Ивицкого”. (Мн., 1979). Выданне з дарчым надпісам А.І.Івіцкага Г.В.Багамолаву. Дадатак: пісьмо А.І.Івіцкага да Г.В.Багамолава з падзякай за віншаванне з нагоды 75-гаддзя з дня нараджэння. Друк, рукапіс, на рускай мове. | 1979 ліп.18 | 14 | |
| | 167. | [Праграма] 7-га штогадовага сходу Еўрапейскага геафізічнага таварыства і 17-й Генеральнай Асамблеі еўрапейскага сейсмалагічнага камітэта (Будапешт, 1980). Друк, на англійскай мове. | 1980 | 11 | |

# ВОПІС

| Парадкавы нумар | Справаводны нумар | ЗАГАЛОЎКІ АДЗІНАК ЗАХАВАННЯ | Даты пачатку і заканчэння (крайнія даты) | Колькасць лістоў | Заў-вагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | | ДААПІСАННЕ. | | | |
| | 168. | Схематычныя структурныя карты, структурныя схемы, карты перспектыў нафтагазаноснасці і інш., складзеныя Г.В.Багамолавым. Белавікі, чарнавік, фрагмент. Дакументы пазначаны экслібрысам фондаўтваральніка. На рускай мове. | 1970, 1971 і б/д | 19 | |

У дадзеным вопісе апісаных і пранумараваных адзінак захавання 168 (сто шэсцьдзесят восем).

Сакавік 2009 г. _________________

У дадзеным вопісе падшыта і пранумаравана 33 (трыццаць тры) старонкі + ______ старонкі – уводная частка.

Сакавік 2009 г. _________________